Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 9 (287) | Пятніца 29 сакавіка 1957 года | Цана 20 кап.

КАЛІ КОМСАМОЛЬЦЫ ПАСІЎНЫ

На IV курсе геолага-геаграфічнага факультэта ішоў комсамольскі сход. Комсорг Ф. Жукаборскі рабіў даклад аб выніках зімняй экзаменацыйнай сесіі. Закончыўшы даклад, комсорг з палёгкай уздыхнуў, выцер пот з ілба і запытаў:

— Хто будзе выступаць, таварышы?

Наступіла няёмкая цішыня. Кожны займаўся сваёй справай: хто чытаў чарговае апавяданне аб шпіёнах, хто глыбокадумна пазіраў на столь. Ніхто не слухаў дакладчыка.

Комсорг яшчэ некалькі разоў звярнуўся да нямой аўдыторыі, пераконваў таварышаў, што пагаварыць, мауляу, ёсць аб чым, што такая пасіўнасць не да твару комсамольцам і т. д. Нішто не дапамагло. Сход так і закончыуся дакладам комсорга і яго-ж выступленнем у спрэчках.

У гэтым выпадку няма нічога выключнага. Такія сходы для многіх комсамольскіх груп і курсаў і нават факультэтаў універсітэта надзвычай характэрны. Прыдуць комсамольцы на сход (добра, калі прыдуць), паслухаюць (а часцей за усё не слухаюць) штатных прамоуцау, прагаласуюць за чарговую рэзалюцыю і разыйдуцца дадому. Задаволены яны сходамі, ці не? Часцей за усё абыякавы. А комсорг задаволены: сход прайшоу, як і патрабавала форма. У пратакол запісана аб выкананні чарговага пункта плана работы.

Вось адсюль і пачынаецца пасіўнасць комсамольцаў, іх абыякавасць да усяго, што праводзіцца у групе, на курсе, абыякавасць таму, што усё гэта праводзіцца кожны год па адной схеме. Зімой, напрыклад, праводзяцца сходы аб падрыхтоуцы да сесіі, потым аб яе выніках. Вясной —аб падрыхтоуцы да вясенняй сесіі і другі сход аб яе выніках. Апошні сход часцей за усё праводзіцца восенню новага навучальнага года.

Гэта асноуныя мерапрыемствы большасці, калі не ўсіх комсамольскіх груп універсітэта. Праўда, яшчэ ў плане работы можа стаяць: зімой—лыжная прагулка, якая часцей за ўсё зрываецца, восенню шахматна-шашачны турнір.

Безумоуна, пры такой рабоце комсамольскай арганізацыі члены яе заўсёды будуць пасіўнымі. Комсамол—арганізацыя маладых, дзярзаючых, шукаючых новага. Гэта павінны заўсёды памятаць важакі комсамольскіх груп. Але гэтага, на вялікі жаль, вельмі многія не памятаюць і не хочуць памятаць.

Нядауна на аддзяленні матэматыкі праходзіў комсамольскі сход, прысвечаны вынікам сесіі. І як-жа ён прайшоу? Быу, натуральна, даклад. Затым пайшлі спрэчкі. Выступілі тры комсоргі курсаў таму, што ім была даручана, як заусёды, растармашыць «актыунасць» мас, тры выкладчыкі і сакратар партбюро тав. Гусак. А комсамольцы не выступілі. Прагаласаваўшы за рэзалюцыю, яны разышліся.

Факт, зразумела, невясёлы. Але хто ў гэтым вінават, калі не тыя-ж штатныя аратары з актыву? Гэта ад іх пачынаецца пасіўнасць, таму што іх выступленні заусёды пабудаваны па адной і той-жа схеме: упамянуць аб выдатніках, зрабіць папрок у адрас «двоечнікаў» і падвесці пад усё гэта адпаведную мараль. Хіба такія аратары патрэбны ў групе? Не! Патрэбна, каб радавыя комсамольцы без шпаргалак выступалі самі, таварыші горача аб тым, аб чым неабходна гаварыць, аб чым не дае маўчаць сумленне сапраўднага комсамольца.

Пасіўнасць у комсамольскіх групах пануе таму, што комсоргі, сакратары комсамольскіх бюро лічаць сябе на пасадзе нейкіх чынуш і спісваюць горы пратаколаў і планаў. Але няма у іх адзінага і асноўнага—прызвання комсамольскага кіраўніка. Так, кіраваць комсамольскай групай таксама трэба мець прызванне. У нас-жа у групах склалася такая практыка: няхай выбіраюць у сакратары каго хочаш, абы не мяне.

На тым-жа аддзяленні матэматыкі, (I група II курса) комсамольцы абралі групоргам студэнта А Бачыла. Абралі, ведаючы загадзя, што гэты комсамолец не здолее кіраваць групай. І, вядома, ні аб якой сур'ёзнай комсамольскай рабоце ў групе не можа быць размовы.

Такія з'явы ва універсітэцкай комсамольскай арганізацыі вельмі частыя. Аб іх ведаюць і на факультэтах, і у камітэце комсамола. Але аб іх маўчаць. Пасіўнічаюць самі актывісты!

Цярпець такія з'явы далей нельга. Трэба выкарчоўваць з коранем пасіўнасць і фармалізм з комсамольскай работы. І ўзяцца за гэта трэба самім комсамольцам!

НОВЫЯ ЭКСПАНАТЫ

З года у год расце наш заалагічны музей. Нядаўна адміністратыўна-гаспадарчай часткай праведзен рамонт памяшкання. Супрацоунікі музея значна папоўнілі калекцыі экспанатаў.

З рэдкіх звяроў набыта еурапейская норка, якая водзіцца ў межах БССР, любіць захламленыя месцы каля вадаёмаў і надзвычай цэніцца футрам. Апрача гаго ёсць тхор чорны і звычайная вавёрка. З птушак супрацоунікамі музея у раёне возера Лукамль знойдзена больш пяцідзесяці экземпляраў мясцовай арнітагрупы. Папоунілася калекцыя птушак з раёна возера Чырвонае. За апошні час у музей паступіў даволі рэдкі экземпляр фарэлі, якая водзіцца ў невялікіх шпаркаплынных рэках, у тым ліку і ў Свіслачы. Гэты экземпляр важыць каля і кілаграма.

Хутка наведвальнікі музея ўбачаць біягрупу «Драпежнікі», для мантажа якой у музей паступілі тры скуры ваукоу, запаляваных у наваколлі горада Уэда.

С. СЯРГЕЕЎ.

НА ВУЧОНЫМ СОВЕЦЕ

22 сакавіка адбыўся чарговы Вучоны Совет нашага універсітэта. На яго пасяджэнні быу абмеркаван даклад прарэктара па вучэбнай частцы т. Малышава «Аб выніках зімняй экзаменацыйнай сесіі 1956—1957 года і задачах універсітэта ў другім семестры».

Па абмеркаванаму пытанню выступілі прафесар Дарожкін, прафесар Ярафееў, дацэнт Рудзінскі, прафесар Асіпенка, дацэнт Некрашэвіч, рэктар універсітэта прафесар Лукашоў.

*

Стэнд „У свеце навукі і тэхнікі", размешчаны у вестыбюлі біялагічнага корпуса, прыцягвае ўвагу студэнтаў.

*

ТРЫМАЦЬ СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

Нядауна ў нас на фізмаце пры кафедры эксперыментальнай фізікі была створана група навукова-тэхнічнага садзейнічання Маскоускаму поуправадніковаму заводу. Ў яе уваходзяць студэнты III і IV курсаў. На заводзе часта ўзнікаюць пытанні, звязаныя з тэхналогіяй вырабу і якасцю прадукцыі. Для вырашэння іх даводзіцца затрачваць многа сродкаў і часу. Акрамя таго, лабараторыі і канструктарскае бюро заняты распрацоукай планавых заданняў і таму не могуць заўсёды заняцца рознастайнымі пытаннямі, узнікаючымі у працэсе вытворчасці і эксплуатацыі поуправадніковых прыбораў. Таму завод звярнуўся да нашай кафедры з просьбай дапамагчы у рашэнні некаторых праблем, а таксама паутарыць рад даследаванняў, зробленых ужо, каб пераканацца у правільнасці вынікаў.

Кіруе групай дацэнт Некрашэвіч. Студэнты размеркаваны на групы па 2—3 чалавекі. Кожная група працуе над пэўнай праблемай. Напрыклад, студэнты Адэрыко і Мазоуко займаюцца даследаваннем прабівання фармаваных селенавых вентыляў, Глебка і Окунь вывучаюць прабой нефармаваных вентыляў і г. д.

Вынікі работы дакладваюцца на пасяджэннях, дзе іх абмяркоувае ўся група.

Пажадана было-б, каб гэта сувязь з заводам расла і каб нашы студэнты, якія цікавяцца пытаннямі вытворчасці і аказваюць дапамогу заводу, праходзілі вытворчую практыку на гэтым-жа заводзе.

Э. ТАЧЫЦКІ,
Н. КАРАТАЕЎ,
М. АНКУДА,
студэнты фізмата.

Дыпломныя па матэрыялах практыкі

Мая дыпломная работа—вынік двухгадовай практыкі ў калгасе «Кастрычніцкая рэволюцыя» Дзержынскага раёна. Працавала я там разам з Л. Ярчакоускай.

Спачатку я меркавала выкарыстаць матэрыял для курсавой работы. Але у гэтым годзе я рашыла удакладніць некаторыя палажэнні, зрабіць абагульненні, расшырыць тэму і напісаць дыпломную работу. Мая сяброука Л. Ярчакоуская рашыла зрабіць тое-ж самае. Тэма маёй дыпломнай: «Глебы калгаса «Кастрычніцкая рэволюцыя» Дзержынскага раёна, іх аграхімічная характарыстыка і меры павышэння урадлівасці». У Ярчакоускай тэма дыпломнай носіць геаграфічны характар.

З кіраўніком дацэнтам Н. П. Булгаковым мы сустракаемся кожны дзень. У любы час можна атрымаць кансультацыю у В. І. Пашына. Такая цесная сувязь з кіраўнікамі вельмі дапамагае у рабоце.

Зараз ужо уся аналітычная работа закончана, лічбовыя даныя згрупаваны у табліцы, чытанне асноунай літаратуры таксама скончана. У гэтыя дні рыхтую да праверкі трэцюю главу работы.

Як дадатак да дыпломнай, рыхтую картаграмы: патрэбнасць глебы у вапнаванні, наяунасць фосфара у глебах, а таксама глебавую карту.

Вынікі нашых работ кафедра глебазнауства перадасць для выкарыстання іх у практыцы.

Н. ХОХ, студэнтка-дыпломніца.

Гэты здымак зроблен на практычных занятках па мікрабіялогіі. Студэнтка біёлага-глебавага факультэта Светлана Петровіч разлівае ў прабіркі пажыўныя асяроддзі для вырошчвання мікробаў. Праз некаторы час другакурсніцы будуць вывучаць прыгатаваныя імі саставы.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

ЗАДАЧЫ МОЛАДЗІ

Зрабіліся ўжо традыцыяй сустрэчы студэнтаў універсітэта са знатнымі людзьмі рэспублікі, ватарамі вытворчасці, членамі ўрада БССР.

23 сакавіка такая сустрэча адбылася ў зале Пасяджэнняў Вярхоунага Совета БССР. Перад студэнтамі універсітэта выступіў Старшыня Прэзідыума Вярхоунага Совета БССР тав. В. І. Казлоў.

Тав. Казлоу В. І. расказаў аб тых важнейшых праблемах, якія рашаліся на VI сесіі Вярхоўнага Совета СССР і IV сесіі Вярхоунага Совета БССР, на лютаўскім Пленуме ЦК КПСС.

Значную частку выступлення В. І. Казлова складаў зварот да моладзі і студэнтау універсітэта. У гэтым звароце В. І. Казлоу раскрыў тыя задачы, якія стаяць перад моладдзю нашай краіны і рэспублікі і на гэтай падставе дау глыбокі аналіз работы грамадскіх арганізацый універсітэта.

Калі ўзяць падшыўкі пратаколаў і справаздач камітэта комсамола і прафкома універсітэта, то на кожнай старонцы можна прачытаць аб праведзеных палітінфармацыях, лекцыях, дакладах і г. д. Паводле пратаколаў работа ідзе поуным ходам. На самой-жа справе работа у комсамольскай арганізацыі універсітэта вядзецца на нізкім узроўні.

У першым семестры студэнты універсітэта прапусцілі звыш 13 тысяч вучэбных гадзін без уважлівых прычын. Асабліва вызначаюцца у гэтым напрамку студэнты аддзялення журналістыкі.

Гэтае-ж аддзяленне журналістыкі магло-б аказаць вялікую дапамогу прадпрыемствам і установам Мінска у арганізацыі выпуска насценных газет. Вялікую дапамогу аказалі-б студэнты філфака, узяшы на сябе арганізацыю літаратурных вечароу, канферэнцый чытачоу, дыспутау на заводах і у школах. Між тым, яны гэтага не могуць нават у сябе арганізаваць як належыць. Або чаму-б студэнтам фізмата не дапамагчы заводскім рацыяналізатарам?

В. І. Казлоу гаварыу далей аб неабходнасці працоунага выхавання студэнтау і моладзі. Частку сваіх летніх канікул студэнты маглі-б з поспехам прысвяціць рабоце у калгасах, на будоулях і г. д. Комсамольская арганізацыя універсітэта павінна убачыць у гэтым глыбокі сэнс. Змагацца з тымі, хто лічыць для сябе працу справай, прыніжаючай годнасць,—пярвейшая задача моладзі.

У выхаваучай рабоце з моладдзю комсамольская арганізацыя заусёды павінна улічваць уплыу буржуазнай ідэалогіі. Раскрываць заусёды і усюды праваканцыйныя чуткі, даваць адпор нігілістычным настроям, якія авалодалі некаторай часткай моладзі. Процідзеем у гэтым выпадку павінна быць штодзённае выхаванне любві да працы, выхаванне калектывізму, сяброуства, выхаванне атэізма ў моладзі.

Комсамольцы, лепшая частка нашай моладзі, павінны заўжды змагацца за прывіццё добрага густу у адзенні, за маральную чысціню, пераймаць і развіваць далей лепшыя нацыянальныя традыцыі народа.

Выступіушыя пасля даклада В. І. Казлова студэнты універсітэта далі цвёрдае комсамольскае слова няухільна выконваць усе задачы, якія ставіць Комуністычная партыя перад комсамолам.

Падобныя сустрэчы маюць вялікае выхаваучай значэнне. Толькі камітэту комсамола і прафкому універсітэта да іх арганізацыі трэба адносіцца больш сур'ёзна.

В. МАЦКЕВІЧ.

У абстаноўцы безадказнасці

Калі зойдзеш у вестыбюль фізіка-матэматычнага корпуса, кідаецца ў вочы натоўп студэнтаў каля шыльды «Бюлетэнь СНТ».

«Няйнакш новы нумар выпушчаны,—узнікае адразу думка.—Кагосьці прапясочылі».

Калі-ж падыходзіш бліжэй, першае ўражанне хутка змяняецца нечаканым здзіўленнем.

— Дзяўчаты, у ауторак «Аіда»,—раздаецца звонкі голас белакурай першакурсніцы.—Трэба заказаць білеты.

— А мы пойдзем на канцэрт Грыгорыя Гегучадзе,—кідае ёй у адказ шустрая сяброўка і уважліва разглядае другую афішу.

Толькі цяпер разумееш, які змест прыцягнуў на гэты раз увагу студэнтаў. Сёння тут вывесілі новую тэатральную рэкламу. Крыху вышэй чатырма шпількамі трапна прыколата аб'ява спартыунага таварыства.

Пустая плошча органа СНТ дауно стала месцам размяшчэння тэатральнай рэкламы і усялякіх аб'яў. Яно і не дзіўна, бо за увесь бягучы навучальны год рэдкалегія, узначальваемая студэнтам IV курса Ігарам Сасункевічам, выпусціла толькі адзін нумар «Бюлетэня», ды і той не вызначаўся цікавым зместам.

Калі заходзіць гутарка аб насценнай газеце, у членаў рэдкалегіі заўжды адзін адказ:

— Няма аб чым пісаць, гурткі працуюць слаба, дасягненняў няма.

Спасылкі на адсутнасць цікавых фактаў, якія прыводзіць у сваё апрауданне рэдкалегія СНТ, нельга прызнаць сур'ёзнымі. На аддзяленні матэматыкі працуюць чатыры навуковых гурткі, сярод якіх асабліва вызначаюцца такія, як па вышэйшай алгебры (кіраунік Д. А. Супруненка) і па геаметрыі (кіраунік Л. Тутаеу). Члены гэтых гурткоу падрыхтавалі і выступілі з шэрагам дакладау, абмеркаванне якіх праходзіла, жыва, цікава і на высокім тэарэтычным узроуні.

Чаму-б «Бюлетэню» не абагуліць на сваіх старонках вопыт работы гэтых гурткоў і не зрабіць яго здабыткам усіх членаў таварыства?

Больш таго, эксперыментальная работа студэнтаў дазволіла факультэту вылучыць на прадстаячую навуковую канферэнцыю у горад Рыгу пяць сваіх прадстаунікоў з уласнымі навуковымі работамі. На канферэнцыі студэнты І. Зяцькоў, В. Шчарбакова, С. Гусеу, А. Бартман і Т. Перельман зробяць паведамленні аб ходзе навуковай работы студэнтау фізмата і аб сваіх даследах.

Студэнты Н. Аляхновіч (V курс) і В. Спрынчук (III курс) выедуць на студэнцкую канферэнцыю у горад Ерэван. Усе гэтыя факты не могуць не цікавіць студэнцкую грамадскасць. Аб іх і трэба было напісаць у сценгазеце СНТ. Нядрэнна было-б даць выступленні тых таварышау, якім прадстаіць паездка, каб яны падзялілися сваімі дасягненнямі у першую чаргу са студэнтамі нашага універсітэта.

Тэматыка работ навуковага таварыства павінна быць цесна увязана з вопытнай работай кафедрау. Студэнцкія работы, нібы цагліны новага будынку, увахоздяць састауной часткай у распрацоуку праблем, якімі займаецца увесь навуковы калектыу факультэта.

Таму хочацца часцей бачыць на старонках «Бюлетэня» выступленні вядучых вучоных, у якіх-бы падрабязна расказвалася аб рабоце кафедрау і гурткоу, вызначалися-б не высветленыя пытанні з мэтай акцэнтаваць на іх увагу студэнтау.

Нядрэнна было-б таксама выкрыць на старонках газеты прычыны дрэннай работы таварыства на аддзяленні фізікі, дзе існуе толькі два навуковых гуртка; разабрацца, чаму прыпынілися заняткі у гуртку, якім кіруе Ф. Т. Нечай.

Але рэдакцыя і асабіста тав. Сасункевіч праяуляюць выключную непаваротлівасць і пусцілі справу на самацёк. Не можа не адбівацца адмоўна на рабоце рэдакцыі і той факт, што Сасункевіч імкнецца усё зрабіць адзін, не прыцягваючы для арганізацыі матэрыялау другіх членаў рэдкалегіі і актыу СНТ.

Паказваць работу лепшых навуковых гурткоу, членаў СНТ, будзіць цікавасць у студэнтау да навукі, смела і больш аператыўна выкрываць недахопы —надзённая задача рэдкалегіі студэнцкага навуковага «Бюлетэня».

А. МАЛАШКА.

Пісьмо у рэдакцыю

НЕПРЫСТОЙНЫ УЧЫНАК

Нам, студэнтам V курса, на працягу вучобы ва універсітэце шмат даводзілася працаваць у Дзяржаунай бібліятэцы імя Леніна. Надоуга запомняцца гэтыя дні, і мы са шчырай удзячнасцю будзем успамінаць работнікау бібліятэкі, якія заусёды ішлі насустрач нашым пажаданням, дапамагалі падбіраць неабходную літаратуру, стваралі усе умовы для працы. І вельмі крыудна становіцца, калі некаторыя таварышы не цэняць гэтага і зневажальна адносяцца да іх работы.

Мы абураны паводзінамі студэнта нашага універсітэта І. Матошка, які займаецца на III курсе хімічнага факультэта. 15 сакавіка ён абразіу самага паважанага работніка аддзела заказау Ларысу Вікенцеуну Шахрай толькі за тое, што заказаная ім кніга была адаслана у кнігасховішча, бо устаноўлены тэрмін скончыуся, а чытач не з'явіуся.

Ларысу Вікенцеуну мы ведаем як лепшага і чулага работніка. У аддзеле заказау яна працуе ужо многа год. Акрамя добрага аб ёй няма чаго сказаць.

Учынкам студэнта Матошка былі абураны усе прысутныя. А нам, студэнтам універсітэта, было соромна за яго перад усімі.

Мы патрабуем, каб непрыстойны учынак т. Матошка не застауся па-за увагай грамадскасці універсітэта, комсамольскай і профсаюзнай арганізацый хімфака.

І. ДЗЯЖКО,
І. ЧЫГРЫНАЎ,
Н. ДАРАШЭНКА,
студэнты-дыпломнікі.

По слядах нашых выступленняў

У нашай газеце было змешчана пісьмо дырэктара бібліятэкі універсітэта тав. Любінай, у якім гаварылася, што многія студэнты несвоечасова здаюць кнігі. Пісьмо было накіравана на рэагаванне у вучэбную частку універсітэта. Тав. Майракау паведаміу, што факты, аб якіх гаварылася у пісьме, пацвердзіліся. Рэктаратам універсітэта і бібліятэкай прыняты меры па ліквідацыі указаных недахопаў.

ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

Аудыторыя ледзь змагла умясціць усіх жадаючых, што прыйшлі паслухаць івана Грыгор'евіча Новікава, карэспандэнта «Советской Белоруссии», якога запрасіла сустрэцца са студэнтамі кафедра эканамічнай геаграфіі.

У якасці карэспандэнта беларускай прэсы тав. Новікау прысутнічаў на XI сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных нацый. Цікава паслухаць расказ такога чалавека! А цікавага Іван Грыгор'евіч расказау многа чаго. Тым больш змястоунай была сустрэча, што раскачыку прышлося адказваць на шматлікія пытанні дапытлівых студэнтау.

З самага пачатку расказчык запаланіу аудыторыю. Проста, са шматлікімі яркімі прыкладамі расказау ён, наколькі разыходзяцца у ЗША свабода на словах і свабода у жыцці. Ды ці можа быць іначай у краіне, дзе долары—вышэй за усё, дзе «уладу маючыя» не грэбуюць самымі цынічнымі сродкамі, калі апошнія вядуць да нажывы. А простаму амерыканцу хіба спагадае той, каму даражэй за усё на свеце свой уласны добрабыт? Іван Грыгор'евіч прывёу такі прыклад. На сельскую гаспадарку адпускаюцца сродкі зусім не для таго, каб яна развівалася. Бо пры гэтым яшчэ большым будзе лішак прадукцыі, цэны на якую гаспадарам выгадна трымаць высокімі. Долары адпускаюцца тым, хто згодзен скарачаць свае пасеуныя плошчы. Да такіх махінацыі прыбягаюць (хаця і дарэмна) амерыканскія дзяльцы, каб хоць на нейкі час аддаліць эканамічны крызіс.

Надзвычай цёпла, задушэўна расказау Іван Грыгор'евіч аб сваіх сустрэчах з Э. Л. Войніч. Полем Робсанам. Усе прысутныя з радасцю запісалі адрас Э. Л. Войніч, каб павіншаваць славутую нісьменніцу з днём нараджэння (11 мая 1957 года ёй спауняецца 93 гады).

З пачуццём глыбокага задавальнення студэнты разыходзіліся дадому. Іх гарачыя апладысменты, якімі яны ўзнагародзілі Івана Грыгор'евіча Новікава,—доказ таго, што сустрэча надоуга застанецца у памяці. Хацелася-б мець больш такіх сустрэч.

Н. КРЭМЕНЬ.

Аркадзій Кажэўнікау, другакурснік аддзялення фізікі, сканцэнтравана глядзіць на прыборы. Сваё заданне—знящце характарыстыкі катоднай лямпы і вызначэнне яе параметрау — Аркадзіи выконвае паспяхова.

Фота М. Пільшчыкава

Павышаць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў

А. Я. МАЛЫШАЎ,
прарэктар універсітэта па вучэбнай рабоце.

У цэлым сесія на ўсіх факультэтах прайшла даволі арганізавана пры значна больш высокай патрабавальнасці да ведау студэнтаў, чым на экзаменах у мінулым. Вынікі сесіі па універсітэту сведчаць аб тым, што праграмны матэрыял падауляючай большасцю студэнтаў засвоен нядрэнна.

Трэба адзначыць, што у мінулым семестры павысілася цікавасць студэнтаў да вывучэння соцыяльна-эканамічных дысцыплін, а таксама больш актыуна сталі праходзіць семінарскія і практычныя заняткі па гэтых прадметах. На заліках па грамадска-палітычных дысцыплінах многія студэнты паказалі добрыя веды асноуных палажэнняу марксіцка-ленінскай тэоры. Гэтыя палажэнні цясней сталі увязвацца з жыццём, з падзеямі нашай сучаснасці.

Якія можна зрабіць вывады з мінулай сесіі?

Па-першае, ацэнка ведаў студэнтау праводзілася ва умовах далейшага павышэння патрабавальнасці, а, значыць, была больш аб'ектыунай.

Па-другое, павышэнне патрабавальнасці з'явіцца магутным стымулам да сістэматычнай, сур'ёзнай самастойнай работы студэнтау на працягу усяго года.

У трэціх, зніжэнне колькасці выдатных і добрых адзнак і узрослая колькасць здавальняючых і нездавальняючых адзнак тлумачыцца не толькі узросшымі патрабаваннямі, але і тым, што ва універсітэце маюцца студэнты, якія слаба падрыхтаваны і перацягваліся з курса на курс шляхам неаднаразовых пераздач. Цяпер-жа іх веды были ацэнены аб'ектыуна.

З другога боку, вынікі сесіі гавораць аб тым, што не усе яшчэ выкладчыкі, а значыць, і кафедры, і дэканаты пранікліся духам адзінага падыходу у патрабавальнасці да студэнтау. Мы не можам яшчэ сказаць, што усё намі зроблена ў сэнсе арганізацыі і кантролю за самастойнай работай студэнтау.

Мне думаецца, што у сувязі з гэтым самымі надзённымі і бліжэйшымі задачамі кафедрау і факультэтау з'яуляюцца наступныя мерапрыемствы. Трэба выкарыстоуваць усе магчымасці да ўзмацнення самастойнай работы студэнтау. Неабходна уважліва вывучыць распарадак часу студэнтау, разумна вызначыць іх нарузку для самастойнай работы, вучыць іх працаваць самастойна над падручнікамі, над канспектамі і у лабараторыі. Трэба таксама арганізаваць сістэму мерапрыемстваў па кантролю за самастойнай работай студэнтау, у прыватнасці, па лекцыйных курсах.

Самую сур'ёзную увагу трэба звярнуць на развіццё студэнцкай навуковай работы. Арганізацыя яе ў першую чаргу ускладаецца на кафедры.

Час падумаць на факультэтах аб дазволе студэнтам, якія займаюцца навукова-даследчай работай, наведваць заняткі па індывідуальнаму графіку. Вопыт многіх ВНУ краіны паказвае, што студэнты такой катэгорыі больш плённа выкарыстоуваюць час. Яны датэрмінова здаюць экзамены і уключаюцца у работу на вытворчасці, у лабараторыях, архівах і г. д.

Больш смела трэба ісці на скарачэнне вучэбнай нагрузкі прафесарау і выкладчыкау, занятых важнымі навуковымі даследаваннямі і, разам з гэтым, павялічваць нагрузку прафесарау і выкладчыкау, слаба удзельнічаючых у навуковай рабоце.

Галоуным недахопам вытворчай практыкі студэнтау нашага універсітэта з'яуляецца тое, што яна па-ранейшаму носіць сузіральны характар, а іншы раз служыць дапаынкам для студэнтау і некаторых выкладчыкау. Абавязак кожнай кафедры, факультэта і універсітэта у цэлым—прыняць неадкладныя меры па карэннаму паляпшэнню вытворчай практыкі. Для гэтага перш за усё трэба забяспечыць правядзенне падрыхтоўчай работы на факультэце, кафедры і на прадпрыемствах, а таксама ва ўстановах, каб студэнт атрымаў канкрэтнае месца працы, канкрэтнае заданне, выкананне якога можна было-б праверыць.

Кожны студэнт павінен аказаць пэўную дзейсную дапамогу прадпрыемству, калгасу, установе і даць справаздачу ў гэтым кафедры, факультэту.

Адным з важнейшых пытанняу у рабоце універсітэта з'яуляецца ідэалагічная работа сярод студэнтау. Тут яшчэ у нас вельмі многа сур'ёзных недахопау. Трэба прызнаць, што ў асяроддзі студэнцтва нашага універсітэта яшчэ маюць месца нездаровыя з'явы.

У выхаваўчай рабоце сярод студэнтау павінны прыняць удзел усе выкладчыкі універсітэта, выкарыстоуваючы для гэтага рознастайныя формы. Трэба праводзіць больш масавых, добра арганізаваных лекцый аб комуністычнай маралі, аб сяброустве, калектывізме, аб нормах паводзін у грамадскіх месцах.

Выкладчыкі павінны узмацніць палітыка-выхаваўчую работу у акадэмічных групах, у інтэрнатах. Недапусціма, каб нашы выкладчыкі не бывалі на студэнцкіх вечарах адпачынку, у інтэрнатах.

Некаторыя выкладчыкі не знаходзяць часу для простай, задушэўнай гутаркі са студэнтамі аб «дробязях быта», не імкнуцца пазнаць інтарэсы, зацікауленасць студэнцкай масы.

Яшчэ больш важную ролю павінны выконваць у выхаванні студэнцтва нашы комсамольскія арганізацыі. Яны павінны мацаваць шматлікія сувязі студэнцтва універсітэта з жыццём краіны, прыцягваць студэнтау да удзелу ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, у рознастайных работах па добраупарадкаванню горада, універсітэта і г. д.

Толькі развіваючы творчую ініцыятыву усіх работнікаў, праводзячы выхаваўчую работу сярод студэнтау, можна дабіцца паспяховага вырашэння галоунай задачы, пастауленай перад намі XX з'ездам партыі,—павышэння якасці выпускаемых спецыялістаў і выхавання моладзі, здольнай самааддана працаваць на карысць нашай Радзімы.

ПАГАВОРЫМ АБ ВУЧОБЕ

Тыя комсамольцы, якія кожны дзень наведвалі лекцыі, рэгулярна рыхтаваліся да практычных заняткаў, актыўна удзельнічалі ў грамадскім жыцці факультэта, экзамены здалі на «добра» і «выдатна».

Камсамольцаў Светлану Левіну, Таісу Мішурную, Васіля Максімовіча, Светлану Арцюх, Лідзю Брыль, (III курс), Івана Рэкуца, Вячэслава Янкоускага (I курс), Зіну Курыленка (IV курс) і многіх іншых ведаюць на факультэце і як грамадскіх арганізатараў і як выдатнікаў вучобы. Але ёсць і другая катэгорыя студэнтаў. Гэта тыя, хто дрэнна вучыцца, не рыхтуецца да практычных і семінарскіх заняткаў. Як правіла, і вынікі у іх дрэнныя. Такімі студэнтамі з'яўляюцца Вінаград, Раманчыкава, Бірукова, Карніцкая, Ганчар, Адамчык, Трэгубовіч і другія. Ёсць, нарэшце, і яшчэ адна катэгорыя студэнтаў. Гэта так званыя «чыстыя выдатнікі», інакш кажучы, людзі, якія вучацца на «выдатна» (Майхровіч, Угольнік і іншыя.), але не займаюцца грамадскай работай. Сядзіць такі «чысты выдатнік» і разважае: «Буду толькі добра вучыцца. А займацца спортам, удзельнічаць у мастацкай самадзейнасці—не мая справа». Нажаль, такіх камсамольцаў нямала на факультэце.

Задача састаіць у тым, каб кожны камсамолец не толькі вучыўся добра, але актыўна займаўся грамадскай работай.

У сучасны момант на усіх курсах праходзяць камсамольскія сходы, прысвечаныя вынікам зімовай сесіі. Камсамольцы рэзка крытыкуюць адстаючых, намячаюць канкрэтныя мерапрыемствы па павышэнню паспяховасці і паляпшэнню дысцыпліны. Аднак ёсць такія пытанні, вырашыць якія комсамольская арганізацыя сваімі сіламі не можа. Гэта пытанні агульнаўніверсітэцкага характару. Іх можа вырашыць толькі рэктарат. Хаця ужо дауно вядуцца размовы аб самастойнай працы студэнтаў, аднак належныя умовы для гэтага не створаны. Студэнты перагружаны лекцыямі. Напрыклад, на III курсе аддзялення рускай мовы і літаратуры амаль кожны дзень бывае па 8 гадзін лекцыйных заняткаў. На наш погляд, трэба не толькі скараціць лік лекцый, але і увесці свабодны ад заняткаў дзень. Гэта-б дало студэнтам магчымасць больш занмацца самастойна. Маюцацца і недахопы у правядзенні заліковай сесіі. Некаторыя выкладчыкі не лічацца з раскладам, прымаюць залікі у той дзень, калі гэта ім найбольш выгадна. А у выніку гэтага атрымоуваецца так, што студэнты у адзін і той-жа дзень павінны здаваць па некалькі залікаў. Вось прыклад. Студэнты IV курса аддзялення рускай мовы і літаратуры здавалі у адзін дзень залік па лексікалогіі, літаратурнай рускай мове і спецпадрыхтоўцы.

Трэба наладзіць справу так, каб у час заліковай сесіі студэнтаў вызвалялі ад заняткаў і каб залік па той дысцыпліне, па якой праводзяцца практычныя заняткі, прымаўся у асноўнай масы студэнтаў у ходзе гэтых заняткаў. І толькі у тых студэнтаў, якія дрэнна наведваюць практычныя заняткі, слаба рыхтуюцца да іх, прымаць залік у час сесіі.

Толькі сумеснымі намаганнямі выкладчыкаў, дэканата, рэктарата і грамадскіх арганізацый можна дабіцца поспеху у вучобе і дысцыпліне.

Е. КЛІМАЎ,
сакратар комсамольскага бюро філалагічнага факультэта.

У СВЯТЛЕ НОВЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ

Нядауна увайшло у дзеянне новае палажэнне аб падрыхтоўцы і атэстацыі навуковых і педагагічных кадраў.

Палажэннем прадугледжана прымаць у аспірантуру толькі асоб, якія маюць вопыт практычнай работы не менш двух год па профілю абранай спецыяльнасці і праявіўшых здольнасці да навуковай дзейнасці. Непасрэдна пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы дазваляецца прымаць у парадку выключэння па тэарэтычных дысцыплінах: матэматыцы, фізіцы і некаторых іншых спецыяльнасцях.

У сучасны момант у аспірантуры універсітэта займаецца 41 чалавек на стацыянары і 40—завочна. 10 аспірантаў з 15, прыёму 1956—57 навучальнага года—асобы з практычным вопытам. Акрамя таго, прыкметна паляпшаюцца і умовы вучобы аспірантаў. Так, прапрацаваўшым на практычнай рабоце не менш двух год, устанауліваецца стыпендыя у размеры атрымоуваемага раней акладу, але не вышэй тысячы рублёў. Разам з тым павышаюцца і патрабаванні да работы аспірантаў. Практыка паказвае, што многія кандыдаты навук, закончыўшыя раней аспірантуру, слаба падрыхтаваны да самастойнай даследчай і педагагічнай работы. У сувязі з гэтым, зараз больш увагі удзяляецца тэарэтычнай падрыхтоўцы аспірантаў: больш глыбоку вывучэнню спецыяльных прадметаў, замежнай мовы. Калі раней аспіранты здавалі кандыдацкія экзамены за паутара гады вучобы, то зараз здаюць у два.

Група аспірантаў універсітэта па уласнаму жаданню займаецца вывучэннем некалькіх замежных моў.

Узраслі патрабаванні і да якасці кандыдацкіх дысертацый. За тры гады, побач са здачай кандыдацкіх экзаменаў і праходжання педагагічнай практыкі, аспірант павінен выканаць навуковую работу і далажыць аб ёй на Вучоным Совеце. А перад абаронай дысертацыі асноўныя палажэнні павінны быць апублікаваны.

Большасць аспірантаў 3-га года навучання сур'ёзна працуе над абранымі тэмамі. 16 аспірантаў прадставілі да апублікавання артыкулы па тэмах дысертацый. Найбольш паспяхова працуюць: А. А. Грыгелис (кафедра геалогіі), М. В. Окунь (кефедра палітэканоміі), А. С. Кляучэня (кафедра філасофіі і логікі), Жбанкоу Р. Т. (кафедра спектральнага аналіза).

Аспіранты Я. Хвашчэўская і Л. Казачэнка ужо выступілі з фрагментамі сваіх работ у навуковай перыёдыцы рэспублікі і прынялі актыуны удзел у мінуушай 22-ой навуковай сесіі.

Немалаважнае значэнне для аспірантау набывае выбар тэмы кандыдацкай дысертацыі. Нярэдка ёсць спробы выбіраць тэму дысертацыі, не задумваючыся аб яе навуковай каштоунасці. Такі падыход да справы не мае нічога агульнага з новымі патрабаваннямі партыі і урада да навуковых кадраў.

Так, не зусім прадуманы выбар тэмы аспірантам кафедры гісторыі КПСС тав. Філімоненка прывёу да таго, што на трэцім годзе навучання апошняму давялося замяніць тэму. Гэта вядзе да марнай страты часу і невыканання індывідуальнага плана.

Няправільна зразумелі новыя задачы, якія ставяцца перад аспірантамі у сучасны момант тыя таварышы, якія, у палажэнні аб неабавязковасці абароны дысертацыі у тры гады (як гэта было раней) убачылі магчымасць паслабіць работу над тэмай даследавання.

Пастанова партыі і урада аб паляпшэнні падрыхтоукі і атэстацыі навуковых і педагагічных кадраў адзначае неабходнасць рэзка узмацніць работу з боку аспірантау над выкананнем індывідуальных планаў і па глыбокаму вывучэнню спецыяльных дысцыплін.

Н. ПРАТАСЕВІЧ,
загадчык аддзела аспірантуры.

ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ, *ДАРАГІЯ СЯБРЫ!*

Корпус фізмата. У лабараторыях, абсталяваных рознастайнымі прыборамі і установкамі, праца ў поуным разгары. Тут працуюць студэнты-дыпломнікі V курса фізіка-матэматычнага факультэта. Кожны па-свойму заклапочан. Вось лабараторыя № 4. Гаспадараць у ёй бойкія, жыццёрадасныя дзяучаты Інна Туркіна і Рэня Хмыль. Усё спорыцца у іх руках. Ды і поспеху яны дасягнулі значных! Нават іх аднакурснікі Анатолій Талкачоу, Александр Іуко, Леанід Палянін некалькі зайздросцяць дзяучатам.

У Інны і Рэні блізкія тэмы: «Даследаванне сульфідных выпраміцеляу, залежнасць іх ад тэмпературы і частаты току». Працуюць дзяучаты дауно і упарта. Ужо пасля трэцяга курса узялся яны за курсавую работу на гэтую тэму. Зараз доследы набліжаюцца да канца. Застаецца яшчэ літаратурна апрацаваць і можна абараняць.

У поспеху дыпломніц значная доля працы і іх навуковага кіраунка Сяргея Андрэевіча Кіслякова.

— Бывае, часам, працуеш—працуеш, а потым зойдзеш у тупік. Вось тут нам на дапамогу прыходзіць Сяргей Андрэевіч,—гавораць дзяучаты.

Суседняя лабараторыя № 5 здзіуляе навічка сваім спецыфічным шумам і гулам. За параунауча вялікай устаноўкай з мноствам рознакаляровых правадоу і рознастайных прыбораў завіхаюцца Леанід Палянін і Александр Іуко. Яны папераменна заглядаюць у бліскучы акуляр мікраскопа і ў вялікіх сшытках з'яуляюцца доугія радкі лічбаў.

Мы просім дыпломнікаў расказаць аб сваёй працы.

— Работы шмат, — гавораць яны.—Даследуем электрычныя уласцівасці некаторых каталізатараў. Доследаў правялі нямала. Але, як кажуць, чым далей у лес, тым больш дроу. Так і у нас: здаецца канца не будзе. Вось скончым доследы, падвядзем вынікі—тады бадай што праясніцца. Значна дапамагае нам наш навуковы кіраунік Матвей Якаулевіч Рэзнікаў. У час доследаў узнікае шмат невядомых пытанняў. І Матвей Якаулевіч заусёды дасць грунтоуны адказ.

Тут-жа у рэнтген-устаноукі рухавая, бадзёрая Іра Ільша. Колькі увагі у яе погляддзе! Ды і як-жа! Яна працуе над даследаваннем асаблівасцей рэнтгенавых праменняў. Сапраўды цікавыя доследы!

Сакратар комсамольскага курсавога бюро Анатолій Талкачоу, высокі цёмнавалосы юнак, суступрэу нас ветліва, хоць перад гэтым яму прышлося некалькі агарчыцца.

— Вось як у нас бывае,—гаворыць Анатолій.—Абточваў сёння цэлы дзень вось гэтую невялічкую дэталь з свінца, каб можна было правесці вопыт, а яна нечакана зламалася. І праца цэлага дня вылецела у трубу. Але-ж гэта толькі да слова. Увогуле, справы ідуць нядрэнна. Даследую змяненні правадзімасці поуправадніка у залежнасці ад механічнага даулення. Тэма зусім мала распрацаваная. Прыходзіцца часам цяжкавата.

У лабараторыю, гучна смеючыся, уваходзяць Інна Туркіна і Надзежда Жэнеуская. З імі цёмнавалосы юнак сярэдняга росту.

— Вось, дарагія таварышы,—прадстауляюць дзяучаты нам свайго аднакурсніка,—наш выдатнік, бясспрэчна, будучы прафесар Нікалай Аляхновіч, які ніяк вось не трапіць на вока журналістам.

Нікалай вітаецца, моцна паціскаючы рукі.

— Ну, як справы?—пытаецца ён у аднакурсніка.

Сам Нікалай працуе над дыпломнай работай у фізіка-тэхнічным інстытуце Акадэміі навук БССР. Пасля працоунага дня ён прыходзіць праведаць сваіх сяброу, пацікавіцца, як ідуць у іх справы. Усе яго тут любяць і паважаюць, як чулага, працалюбівага. І сёння у Нікалая ёсць чым парадаваць аднакурсніка: скончыу працу над дыпломнай работай. Засталося аформіць, як належыць і—можна абараняць. На пытанні усіх, хто цікавіцца яе практычным значэннем, Нікалай проста адказвае:

— Вось вашы нажы і іншыя вострыя металічныя рэчы адразу тупеюць, калі імі рэзаць што-небудзь цвёрдае. Тое-ж адбываецца і з многімі станкамі на прадпрыемствах. Зрабіць іх больш устойлівымі—важная задача. А гэта усё залежыць ад эрозіі некаторых металічных сплаваў. Даследаваннем іх я і займаюся.

Многа цікавых спраў у фізікаў-дыпломнікаў. Зараз самая гарачая пара. Не за гарамі абарона дыпломных работ, дзяржаўныя экзамены і далей—шырокая дарога у жыццё. А каб менш на ёй было хібаў, крутых пад'ёмаў, цярністых сцежак, трэба многа ведаць. Аб гэтым памятае кожны з іх. Часта можна бачыць і зараз, як пасля заняткаў ў лабараторыях, фізікі-дыпломнікі працуюць у чытальных залах універсітэта, бібліятэкі, імя Леніна чытаюць тэхнічныя часопісы, навуковую і замежную тэхнічную літаратуру.

Пажадаем-жа ім і надалей плённай працы!

ГАЛІНА НУЖКОВА.

Аркадзій Галышэускі—студэнт IV курса філалагічнага факультэта. Ён вельмі захапляецца музыкай. За гады вучобы Аркадзій набыу радыёпрыёмнік, праігрывацель і мноства пласцінак, большасць з якіх доўгаіграючыя.

НА ЗДЫМКУ: к Аркадзію ў госці прышлі таварышы, каб паслухаць новую пласцінку.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

НА БЫТАВЫЯ ТЭМЫ

ГОРЫЧ НОВАСЕЛЛЯ

Два месяцы назад універсітэцкая грамадскасць з цікавасцю абмяркоувала немалаважную падзею—быу здадзены у эксплуатацыю жылы дом.

Аднак ужо само засяленне гэтага дома замест урачыстасці і радасці прынесла новым жыхарам нямала горычы і прыкрасці. Больш пяці гадзін яны разам са сваімі рэчамі прастаялі на марозе толькі таму, што тав. Бярэзін і камісія, якая прымала дом, не вырашылі ў час усіх неабходных пытанняу і не атрымалі у будаунікоу ключоу ад пад'ездау. Выведзеныя канчаткова з сябе «новасельцы» прымушаны былі ўсяляцца ў свае кватэры... са узломам.

Часам выклікае здзіуленне тая абыякавасць, з якой адносіцца тав. Бярэзін і упрауляючы жылымі дамамі т. Марозау да бытавых патрэб навуковых работнікаў—жыхароу новага дома. На працягу двух месяцау да іх звяртаюцца жыхары кватэр №№ 17, 29, 24, 29 і 30 з просьбай арганізаваць праверку ацяплення, якое працуе надзвычай нерэгулярна. У кватэрах № 24 і 30, напрыклад, тэмпература не бывае вышэй 12—14 градусау, а часцей за усё наогул дзесяць — адзінацаць градусау. Але, нягледзячы на неаднаразовыя заявы жыхароу, ацяпленне і зараз не адрэгулявана. Далей абяцанняу Бярэзін не ідзе.

Наогул, з ацяпленнем справа абстаіць нядобра. Не паспелі здаць дом у эксплуатацыю, а ужо адзін матор (з двух) выйшау са строю. Часта здараюцца перабоі з палівам. Так, напрыклад, 21 сакавіка на заувагу жыхароу, аб тым, што дрэнна грэюцца радыятары, апальшчык адказаў, што няма чаго паліць. Было і такое. Аднойчы (у ноч на 17 сакавіка) апальшчыкам заступіу Буко. Прыйшоу ён на працу п'яным і праспау усю ноч. А чаму так атрымоувасцца? Таму што няма ніякага кантролю.

Значная доля віны за усе гэтыя недаробкі ляжыць, безумоўна, на тав. Марозаве—упрауляючым жылымі дамамі універсітэта. Ён даволі рэдкі госць у гэтым доме. Дастаткова сказаць, што да гэтага часу, Марозау не паклапаціуся нават аб прапіскы жыхароу, што з'яуляецца грубым парушэннем совецкіх законау.

Большасць жыхароу звярталіся да тав. Марозава з просьбай паставіць у кватэрах радыётрансляцыйныя кропкі. Ён абяцаў, але нічога не зрабіў.

Да якога-ж часу тав. Бярэзін, профсаюзная і партыйная арганізацыі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі будуць мірыцца з бяздзейнасцю тав. Марозава?

Звяртаючы увагу нашай гаспадарчай часткі і грамадскасці на неабходнасць стварыць нармальныя бытавыя умовы для навуковых работнікаў, трэба сказаць яшчэ аб адным. Пры праектыроуцы і будаунiцтве дома ніхто не успомніу аб тым, каб падвесці сюды кабель тэлефанізацыі. І зараз усім жыхарам адмоулена аб перанясенні сваіх тэлефонаў на новыя кватэры. У гарадской АТС растлумачылі, што пакуль уладальнік дома (універсітэт) не падвядзе да дома кабель, тэлефанізацыя не будзе магчымай. Пакуль што ніякіх рэальных крокаў у гэтым напрамку не робіцца.

Усе жыхары дома пераканаўча просяць рэктара дапамагчы ім у стварэнні нармальных бытавых умоў.

В. МІХАЙЛАЎ.

ШЭФЫ Ў ШКОЛЕ

«Ці не лепш будзе адмовіцца ад гэтай работы?» — думала студэнтка біёлага-глебавага факультэта Тамара Сакалова, калі ей паведамілі, што яна будзе ўзначальваць зоалагічны гурток у адной з падшэфных школ горада. Хіба мала аб чым захочуць даведацца у яе дапытлівыя дзеці? Яшчэ знарок пачнуць пытацца аб самых розначстайных рэчах, каб збіць з панталыку і пасмяяцца з няўпопытнага шэфа. Не даць адказу на якое-небудзь пытанне немагчыма — згубіш увесь аўтарытэт. Але адступаць, паказваць сваю бездапаможнасць таксама не хацелася. І Тамара дала згоду.

— З чаго пачаць?—было першай думкай Тамары. Хацелася зрабіць так, каб з першых-жа заняткаў захапіць гурткоўцаў, паказаць ім хоць часцінку таго неспазнанага свету, які акаляе нас з усіх бакоў, пазнаёміць з жыццём мікраскапічных арганізмаў, расказаць аб біялагічных працэсах, якія складаюць аснову жыцця. Але яна не ведала, над чым працавалі гурткоўцы без яе, што для іх ужо вядома. Таму Сакалова перш за усё рашыла пазнаёміцца, чым займаюцца дзеці.

Выкладчык заалогіі Аліна Кузьмінічна сустрэла яе ветліва, падрабязна расказала, чым цікавяцца вучні, пазнаёміла з планам заняткаў гуртка.

— Заняткі праходзяць кожны аўторак, — папярэдзіла яна.— Прыходзьце. Толькі майце на ўвазе, што ўмовы ў нас зусім іншыя, чым ва універсітэце. Школа не мае нават мікраскопа.

Тамару не спалохалі гэтыя абставіны: Яна падрыхтавала змястоўны, цікавы даклад аб прасцейшых арганізмах, узяла у лабараторыі мікраскоп, захапіла банку з вадой, на дне якой плавалі інфузорыі і жывая жаба.

Эфект атрымаўся надзвычайны. Нават самыя непаседлівыя вучні слухалі шэфа, як зачараваныя. А калі справа дайшла да мікраскопа, захапленне гурткоўцаў дасягнула вышэйшага накалу. З асаблівай цікавасцю разглядалі яны, як пульсуе кроў у жабы, што можна было назіраць у перапонках лапы, расцягнуўшы яе на палачках.

Аб тым, што даклад вучням падабаўся, гаворыць наступнае. Калі Тамара прыйшла у школу ў другі раз, дзеці напярэдадні прасілі запісаць іх у гурток і таксама даць паглядзець у мікраскоп.

— А як вы вучыцеся?—запытала яна.

— Выдатна!—зашумелі вучні.

Але Сакалова заўважыла, што некаторыя сарамлівa апусцілі вочы, і яна папярэдзіла, што запісваюць у гурток толькі тых, хто мае добрыя і выдатныя адзнакі па усіх прадметах.

З таго часу колькасць гурткоўцаў значна выросла. Яны актыўна наведвалі заняткі, з цікавасцю слухалі лекцыі, задавалі пытанні і самі рабілі невялікія даклады.

Аднойчы гурткоўцы рашылі распрацаваць тэму аб гадзюках. Але экспанатаў у школе не было. Расказваць па малюнках было нецікава. І Тамара дапамагла ім наладзіць экскурсію у заалагічны музей універсітэта. Тут студэнт V курса біёлага-глебавага факультэта Ю. Сапажэнкаў прачытаў дзецям лекцыю аб ядавітых гадзюках, пазнаёміў іх з некаторымі экспанатамі музея. Навіной для вучняў было тое, што яд гадзюк у сучасны момант стараюцца выкарыстаць, як абязбольваючы і кровазгортваючы сродак.

Зараз члены заалагічнага гуртка актыўна рыхтуюцца да сустрэчы птушак. Вучні майструюць шпакоўні. Сакалова дапамагае ім падбіраць кнігі і рыхтуе даклад да будучага «Свята птушак».

Апрача Сакаловай, у гэтай-жа школе працуе студэнтка Т. Жарына. Яна вядзе батанічны гурток і зараз рыхтуецца правесці цікавы вечар на тэму: «Нашы зялёныя сябры» —аб пакаёвых раслінах.

Шэфская работа у школе дапамагае вучням глыбей вывучаць асобныя прадметы, узбуджае цікавасць да новага, невядомага, прывучае іх да самастойнай працы, развівае ініцыятыву. Як правіла, члены такіх гурткоў добра вучацца, многа чытаюць самастойна і у сваіх адказах настаўніку выкарыстоўваюць набытыя у гуртку веды.

З другога боку, гэта дае нашым студэнтам багатую педагагічную практыку, знаёміць іх з характарам і псіхалогіяй дзяцей, пасля заканчэння універсітэта дапаможа правільна наладзіць сваю практычную дзейнасць.

С. ШЧЭРБА.

Школа № 41.

ЗА ГОНАР ФАКУЛЬТЭТА

Новыя задачы стаяць зараз перад вышэйшай школай, па-новаму ставіцца пытанне падрыхтоўкі спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі. Барацьба вядзецца за якасць кадраў. Новае палажэнне аб назначэнні стыпендый з'яўляецца адной з тых мер, якая дазволіла выкладчыкам больш аб'ектыўна падыходзіць да кожнага студэнта у час экзаменаў, ставіць адзнакі, якія характарызуюць сапраўдны стан яго ведаў, вызначаюць якасці будучага спецыяліста. Мінула сесія. На факультэтах падвялі вынікі. Цяпер можна зрабіць некаторыя вывады з атрыманых рэзультатаў. А вывады атрымліваюцца няважныя.

Возьмем для прыкладу фізіка-матэматычны факультэт. Нядаўна тут адбыўся комсамольскі сход аддзялення фізікі, на якім былі абмеркаваны вынікі сесіі. З даклада дэкана факультэта тав. Халімановіча М. П. (садакладчык член бюро аддз. фізікі тав. Вайтовіч) відаць, што нязначнае павышэнне патрабавальнасці рэзка скараціла лік выдатнікаў, а колькасць «троечнікаў» выраслa у некалькі разоў. Калі у мінулым годзе тут было 15 пасрэдных адзнак, то у гэтым—109.

У чым прычына такога небывалага росту нізкіх адзнак? Які клімат спрыяў гэткаму «ураджаю»? Адказ на гэтае пытанне знаходзім у выступленні студэнта III курса тав. Кругліка.

— Многія з нашых студэнтаў,— гаворыць ён,—аказалися у палоне чутак аб вольным наведванні лекцый і сістэматычна прапускалі заняткі. Але самастойна працаваць таксама не лічылі патрэбным. У выніку—прабел у ведах і пасрэдная адзнака на экзаменах.

Варта запытацца: хіба комсамольскае бюро не ведала аб гэтым, што своечасова не прызвала да парадку прагульшчыкаў? Ведала. Але уся бяда ў тым, што комсамольцы, як сказаў у сваім выступленні А. В. Кірсанаў, захварэлі шкоднай і небяспечнай хваробай—самазаспакоенасцю, лічылі, што можна дагнаць упушчанае у час падрыхтоўкі да экзаменаў. Не атрымалася.

Не менш трывожныя факты прыводзілі у сваіх выступленнях комсамольцы Харлап і Шымановіч. На курсах нізкая дысцыпліна, студэнты адмауляюцца выконваць грамадскія даручэнні. На зімніх спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы фізмат заняў пятае месца галоўным чынам таму, што многія не палічылі патрэбным прыняць у іх удзел.

Аб тым, што многія дзейнічаюць па прынцыпу: «кожны за сябе, адзін дэкан за усіх», гаворыць і тое, што амаль палавіна комсамольцаў не з'явілася на сход, а пяты курс прыслаў толькі двух «дэлегатаў».

Правільную думку выказаў тав. А. А. Гусак, які прапанаваў пры выдачы характарыстык пасля заканчэння універсітэта адлюстроўваць адносіны маладога спецыяліста да грамадскага жыцця, без скідак паказваць яго недахопы. Гэта павысіць адказнасць і самадысцыпліну кожнага студэнта.

Дрэнна пастаулена справа з арганізацыяй хора. Студэнтка Клімовіч магла-б з поспехам выступаць харысткай, але яна лічыць за лепшае назіраць за жыццём курса з-за цюлевай фіранкі, не выступаць на сцэне, а сядзець у партэры і «кваліфікавана» крытыкаваць удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Гэта лягчэй і, галоўнае, бестурботней.

З болем і горыччу адзначалі комсамольцы агульны упадак культурна-масавай і выхаваўчай работы на факультэце. Няма ініцыятывы, не адчуваецца сапраўднага агоньку, маладога задору і настойлівасці у дасягненні выдатных поспехаў у вучобе і дысцыпліне.

Ажывіць работу групоргаў, зрабіць групу цэнтрам выхавання студэнтаў, часцей праводзіць сходы, на якіх шырока абмяркоўваць пытанні вучобы і дысцыпліны, павысіць ролю насценнага друку у выхаванні студэнтаў—такую рэзалюцыю прынялі комсамольцы.

Соромна было студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта слухаць дакоры за страчаную славу, за уласную бяздзейнасць. Будзем спадзявацца, што многія зразумелі свае памылкі і зробяць усё магчымае, каб выправіць іх у бліжэйшы час. Рэзалюцыя прынята. Застаецца толькі выканаць яе.

С. СЦЯПАНАЎ.

* *

Вясна. Нямала турбот дастаўляе яна нашым дзяўчатам. Кожнай з іх хочацца мець прыгожую сукенку. Вось чаму так уважліва студэнткі праглядаюць журнал «Моды».

Фота Л. БОНДАРА.

* *

У нас у гасцях

Баскетбол—цікавы від спорту і карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод моладзі. Спартыўная зала ДСТ «Буравеснік» вельмі далёка ад універсітэта, але на нядаўняй сустрэчы, у якой удзельнічалі нашы баскетбалісты, прысутнічала даволі многа нашых студэнтаў.

І вось на пляцоўку выходзяць спартсмены Днепрапятроўскага і Беларускага універсітэтаў. Гасцей віншуе капітан жаночай каманды БДУ Соф'я Навіцкая. Госці ўручаюць нашым спартсменам кубак з надпісам «Баскетбалістам БДУ ад баскетбалістаў Днепрапятроўскага дзяржаунага універсітэта».

Па свістку суддзяў першымі на поле выходзяць жаночыя каманды. Адразу-ж адчуваецца значная перавага спартсменаў БДУ. Першая палавіна гульні заканчваецца з лікам 19:29 у карысць нашых баскетбалістаў.

У другой палавіне баскетбалісты БДУ яшчэ больш актыўна павялі гульню. Яна заканчваецца з агульным лікам 26:59.

У вострай спартыўнай барацьбе пачалася гульня мужчынскіх каманд. У першыя-ж секунды адзін з гасцей забівае мяч з ходу, потым яшчэ адзін. Лік 4:0. Але вось разыграна камбінацыя спартсменам БДУ В. Лотнікам, якая закончылася трапным пападаннем. Лік 4:2. Адчуваецца, што госці валодаюць майстэрствам баскетбола і добрай тэхнікай, але у іх няма зладжанасці, кожны стараецца сам сабе. Таму яны часта губляюць мяч. Усе іхнія памылкі выкарыстоўваюць студэнты БДУ. Лік расце ў іх карысць.

Са спартсменаў гасцей асабліва спадабалася гульня Залатарова, які выдатна валодае тэхнікай баскетбола. Гульня закончылася з лікам 88:115 у карысць студэнтаў БДУ.

А. ПУСТАХОД.

Карло Гальдоні

(Да 250-годдзя з дня нараджэння)

Па рашэнню Сусветнага Совета Міру працоуныя нашай краіны разам з усім прагрэсіўным чалавецтвам адзначылі 25 сакавіка гэтага года 250-годдзе з дня нараджэння вялікага італьянскага драматурга Карло Гальдоні.

У гісторыі італьянскай літаратуры Гальдоні належыць пачэснае месца. У той час, калі ён уступіў у літаратуру, на яго радзіме безраздзельна панавала так званая Камедыя масак, якая узнікла яшчэ у XVI стагоддзі. Тэатр масак паступова страціу свой актуальны социяльна-сатырычны характар і пераутварыуся у відовішча, якое у значнай меры насіла забауны характар. Калі раней камічныя персанажы гэтага тэатра—скупы стары Панталоне, дурны і бясталенны вучоны Доктар, пагардлівы самахвал воін Капітан—адлюстроувалі пэуныя адмоуныя з'явы у тагачаснай рэчаіснасці, то зараз яны ператварылися у штамп і трафарэт.

Заслуга Карло Гальдоні заключаецца перш за усё у тым, што ён на месцы аджыушага тэатра масак стварыу нацыянальную рэалістычную італьянскую камедыю.

Камедыя масак не мела дакладнага літаратурнага тэксту. Для яе пісаўся толькі просты сцэнарый, які акторы трактавалі кожны на свой лад. Акрамя таго камічныя персанажы гэтага тэатра былі пазбаулены індывідуальных рыс характару і ператварыліся паступова у безаблічныя маскі. Карло Гальдоні, праводзячы сваю рэформу, не толькі замяніу імправізацыю літаратурным тэкстам, але, паводле яго уласных слоу, распрацаваў сцэнічныя характары і увёу у драматургію яркія поунакроуныя вобразы людзей, розных па сваіх характарах і якасцях.

У 1738 годзе Карло Гальдоні напісаў і паставіу сваю першую камедыю «Мамоло, светский человек» і гэтым паклау пачатак італьянскай рэалістычнай камедыі.

Камедыі Гальдоні распадаюцца на дзве групы. Першая з іх—гэта камедыя норавау, у якіх драматург рэзка крытыкуе парокі і разбэшчанасць нянавісных яму арыстакратаў. Гэтыя камедыі пісаліся у бурную эпоху асветніцкау, калі вялася рашучая барацьба з феадальнай ідэалогіяй. Вядомыя камедыі італьянскага драматурга—«Слуга двух господ», «Трактирщица» («Хозяйка гостиницы»), «Забавный случай» і другія пранікнуты асветніцкімі ідэямі і верай у перамогу лепшых высокародных ідэалаў.

Другая група твораў Гальдоні—гэта народныя камедыі з жыцця простых людзей Італіі. Сюды адносяцца такія праслаулены камедыі, як «Самодуры», «Синьор Тодера-Брюзга» і асабліва «Кьоджинские перепалки». Некалькі год свайго жыцця Гальдоні правёу у прыгарадзе Венецыі—рыбацкім пасёлку Кьоджэ. Тут ён уласнымі вачыма назіраu цяжкое жыццё рыбакоу, якія кожны дзень, рызыкуючы жыццём, выходзілі у мора за ўловам. Жыццё і быт гэтых людзей Гальдоні і адлюстравау у камедыі «Кьоджинские перепалки».

Камедыі Гальдоні вылучаюцца не толькі сваёй дэмакратычнай накіраванасцю, але і яркай мастацкай формай. Будучы буйнейшым прадстаунпком італьянскай і сусветнай драматургіі, Карло Гальдоні стварыу яркую, бліскучую і разам з тым, простую, даступную для усіх камедыю. У якасці узору можна назваць яго сусветна вядомыя п'есы «Слуга двух господ», «Трактирщица», якія вось ужо на працягу двух стагоддзяу жывуць плённым сцэнічным жыццём.

Апошнія трыццаць год свайго жыцця Гальдоні правёу у Францыі. Ён быу сучаснікам першай французскай буржуазнай рэволюцыі. У Францыі Гальдоні доуга працаваu над сваімі «Мемуарами», якія уяуляюць сабой бясспрэчную цікавасць для усіх тых, хто цікавіцца грамадскім, тэатральным, літаратурным жыццём Італіі восемнаццатага стагоддзя.

У нашай краіне лепшыя камедыі італьянскага драматурга карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Лепшыя рускія акторы і актрысы выступалі у п'есах Гальдоні.

Хутка пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі у Ленінградскім Вялікім драматычным тэатры імя Максіма Горкага была ажыццёўлена пастаноўка «Слуги двух господ», у якой ролю Труфальдзіно выконваu выдатны совецкі артыст Манахаu. Некалькі пазней у МХАТе была пастаулена «Трактирщица», у якой удзельнічалі Кніпер-Чэхава, Станіслаускі, Мейерхольд і другія вядомыя артысты.

Вялікім поспехам п'есы Гальдоні карыстаюцца і ў беларускага гледача. Беларускі акадэмічны драматычны тэатр імя Янкі Купалы нядаўна паказаў камедыю Гальдоні «Ілгун», рускі драматычны тэатр БССР імя Горкага паставіу бессмяротную камедыю Гальдоні «Хозяйка гостиницы».

Жыццёрадасныя, бадзёрыя, пранікнутыя дэмакратычнымі ідэямі творы вялікага італьянскага драматурга Гальдоні блізкі і зразумелы совецкаму гледачу. Прайшоушы выпрабаванне часам лепшыя камедыі Гальдоні па праву занялі значнае месца у скарбніцы сусветнай драматургіі.

Н. ЛАПІДУС,
кандыдат філалагічных навук.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

АТ 01424 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 369 Тыраж 2000

Рэдактар А. ВОЛК.